View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА І ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Электронны зборнік навуковых артыкулаў
IV міжнароднай навуковай канферэнцыі
да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта

(Полацк, 19–20 красавіка 2018 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А. І. Корсак

Наваполацк
ПДУ
2018

PolotskSU

УДК 94(476)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43

Рэдакцыйная калегія: д-р гіст. навук, праф. Д. У. ДУК;
канд. гіст. навук, дац. В. В. ДАНІЛОВІЧ;
чл.-кар. НАН Беларусі, д-р гіст. навук, праф. М. Ф. ПІЛІПЕНКА;
канд. гіст. навук, дац. А. І. КОРСАК (адк. за вып.);
канд. гіст. навук, дац. В. А. ЕМЯЛЬЯНЧЫК;
канд. гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ

Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў [Электронны рэсурс] : электрон. зб. навук. арт. IV міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 крас. 2018 г. / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; пад агул. рэд.: А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

ISBN 978-985-531-617-7.

*Выдаецца з 2018 года (у друкаваным выглядзе – з 2004 г.)*

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы IV міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў». Прадстаўлены вынікі археалагічных, антрапалагічных і этнаграфічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, мовазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, мастацтвазнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

Зборнік уключаны ў Дзяржаўны рэгістр інфармацыйных рэсурсаў. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 3031816593 ад 08.10.2018.

Дызайн вокладкі *У. А. Крупеніна*
Тэхнічнае рэдагаванне *Т. А. Дар’янавай, В. П. Міхайлавай*
Камп’ютарная вёрстка *Д. М. Севасцьянавай*

211440, вул. Блахіна, 29, г. Наваполацк, Беларусь
тэл. 8 (0214) 39 40 46, e-mail: a.korsak@psu.by

ISBN 978-985-531-617-7 © Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018

PolotskSU



# ГІСТОРЫЯ І КРАЯЗНАЎСТВА РЭГІЁНА І СУМЕЖНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ (з 1945 г. да пачатку XXI ст.)

УДК 338.2(438)"1990-1993"

## ЭКАНАМІЧНЫЯ РЭФОРМЫ Ў ПОЛЬШЧЫ (1990-1993 гг.) І ІХ ВЫНІКІ

*канд. гіст. навук, дац. Л.А. КОЗІК*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*У канцы 1980-х гг. да ўлады ў Польшчы прыйшлі прадстаўнікі дэмакратычных сіл. Яны заявілі аб пабудове дэмакратычнага грамадства і пераходзе да рыначнай эканомікі. У гэтай сувязі група эканамістаў на чале з Л. Бальцэровічас распрацавала праграму рэформ, якая атрымала назву "шокавая тэрапія". Галоўнымі элементамі эканамічнай трансфармацыі сталі макраэканамічная стабілізацыя, мікраэканамічна лібералізацыя і інстытуцыянальная перабудова, звязаная з прыватызацыяй. Рэформы мелі негатыўныя сацыяльная наступствы, звязаныя ў першую чаргу са з'яўленнем і ростам беспрацоўя ў краіне, а таксама зніжэннем узроўню жыцця значнай часткі насельніцтва. Аднак ужо ў 1993 г. сталі выдавочныя станоўчыя змены ў эканамічным жыцці Польшчы, якія былі замацаваны наступнымі рэформамі.*

*Ключавыя словы: эканамічныя рэформы, Польшча, Л. Бальцэровіч, "шокавая тэрапія", прыватызацыя, беспрацоўе*

Канец 1980-х гг. у Польшчы характарызаваўся з аднога боку напружанымі адносінамі паміж уладай і грамадствам, а з другога – імкненнем дасягнуць кампраміс з мэтай паляпшэння палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў краіне. Праявай апошняга сталі перамовы кіраўніцтва Польскай аб'яднанай рабочай партыі і саюзных партый з прадстаўнікамі апазіцыі – пераважна дзеячамі незалежнага прафсаюза "Салідарнасць". Вынікі перамоў, якія працягваліся з лютага па красавік 1989 г., азначалі перамены як у палітычным, так і эканамічным жыцці Польшчы. У краіне былі адноўлены пасада прэзідэнта, вышэйшая палата парламента – Сенат, быў легалізаваны прафсаюз "Салідарнасць", а прадстаўнікі апазіцыі атрымалі магчымасць удзельнічаць у парламенцкіх выбарах. І хаця ў адпаведнасці з дамоўленасцю колькасць месцаў, на якія яны маглі прэтэндаваць, была абмежавана 35 %, гэта быў несумненны крок да дэмакратычных перамен.

У жніўні 1989 г. у Польшчы паўстаў урад на чале з дарадцам "Салідарнасці" Т. Мазавецкім. Менавіта гэтаму кабінету прадстаяла распрацаваць праграму палітычных і эканамічных рэформ, якія б дазволілі краіне выйсці на дэмакратычны шлях развіцця і перайсці ад планавай да рыначнай эканомікі.

Умовы, у якіх шла распрацоўка праграмы эканамічных рэформ, былі складанымі. Гэта было абумоўлена дэфіцытам бюджэта, які папярэднія ўлады спрабавалі "ліквідаваць" павелічэннем выпуска грошай, што ў сваю чаргу прывяло да росту інфляцыі (а фактычна – гіперінфляцыі), моцнай залежнасцю ад сувязей з СССР і краінамі СЭУ, вялікім замежным

PolotskSU



доўгам [1, с. 255; 2, s. 260]. У самім грамадстве ў той час назіраліся задаволенасць палітычнымі пераменамі і спадзяванні на тое, што прадстаўнікі "Салідарнасці" змогуць палепшыць эканамічную сітуацыю ў краіне.

Распрацоўшчыкі канцэпцыі рэформ стаялі перад выбарам стратэгіі – правядзенне радыкальных рэформ у кароткі тэрмін альбо паступовая, працяглая ў часе, эвалюцыя існуючай эканамічнай сістэмы. З улікам сітуацыі, якая склалася ў Польшчы, стаўка была зроблена на першы варыянт. Ён прадугледжваў, што перамены будуць адбывацца ва ўсіх сферах гаспадарчай дзейнасці больш-менш раўнамерна і вельмі хутка, а таму рэформа атрымала назву "шокавая тэрапія" [3, s. 74].

Бацькам "шокавай тэрапіі" лічыцца міністр фінансаў Л. Бальцэровіч, пад кіраўніцтвам якога ў канцы 1989 г. была распрацавана ідэя і спосабы пераходу краіны да рынкавай эканомікі. Прапанаваны пакет рэформ быў зацверджаны польскім парламентам і прэзідэнтам напрыканцы 1989 г. і прадугледжваў пачатак іх рэалізацыі з 1 студзеня 1990 г. [1, с. 258]. План Бальцэровіча складаўся з 5 элементаў: жорсткая грашовая і падаткавая палітыка, а таксама палітыка ў галіне прыбытку, лібералізацыя цэн, частковая канвертуемасць нацыянальнай валюты (злотага). Галоўнымі элементамі эканамічнай трансфармацыі з'яўляліся макраэканамічная стабілізацыя, мікраэканамічная лібералізацыя і грунтоўная інстытуцыйная перабудова, звязаная з прыватызацыяй. Усе гэтыя элементы былі моцна павязаны паміж сабой [3, s. 72, 78].

Праграма складалася з шэрагу законаў, якія прадугледжвалі ліквідацыю гарантый існавання ўсіх дзяржаўных прадпрыемстваў, забарону неабмежаванага фінансавання бюджэтнага дыфіцыту Польскім Нацыянальным банкам шляхам выкарыстання беспрацэнтнага крэдыту (з гэтага моманту бюджэтны дэфіцыт дзяржавы можна было пакрываць толькі крэдытамі, а не грашовай эмісіяй), ліквідацыю крэдытных прэферэнцый для дзяржаўных прадпрыемстваў і звязванне працэнтаў па крэдытах з працэнтам інфляцыі, замаражванне росту заробкаў (ён мог быць, але не звыш афіцыйнага ўзроўню інфляцыі; калі пастанова парушалася, прадпрыемства плаціла большыя падаткі і штраф), увядзенне адзінага 40-працэнтнага падатку ва ўсіх сектарах эканомікі, продаж замежнымі прадпрыемствамі дзяржаве валюты і каштоўных папер па вызначаным нацбанкам курсе (гэта дазваляла вывозіць прыбытак за мяжу і вызваляла прадпрыемствы з замежным капіталам ад выплаты павышанага падатку на рост заробкаў), увядзенне адзінага курса валют, забарону на валютныя рахункі ў банках, ліквідацыю валютных крамаў, увядзенне адзіных мытных падаткаў на імпартныя тавары, дазвол на існаванне афіцыйнага беспрацоўя, акрэсленне ўмоў звальнення з працы (гарантыі фінансавых выплат пры звальненні і ўвядзенне разавай часовай дапамогі для беспрацоўных) [4–15].

Яшчэ напярэдадні рэалізацыі праграмы рэформ урад прыняў рашэнне аб лібералізацыі цэн. Гэта прывяло да таго, што ўжо ў другой палове 1989 г. кошты на прадукты харчавання выраслі больш за 450 %, на спажывецкія тавары – больш за 200 %, а на паслугі – больш за 180 %. Відавочна, што рост заробкаў не паспяваў за ростам цэн, а таму назіралася падзенне ўзроўню жыцця насельніцтва прыкладна на 20 % [16, с. 165].

Лібералізацыя цэн, скарачэнне льготнай падтрымкі дзяржаўных прадпрыемстваў, замарожванне росту заробкаў першапачаткова прывялі да падзення ўзроўню вытворчасці і ўзроўню жыцця насельніцтва. У краіне з'явілася беспрацоўе, паказчыкі якога да 1993 г.

PolotskSU



увесь час раслі [2, s. 81]. Гэта выклікала незадаволенасць грамадства, у абарону якога ў чарговы раз выступіла “Салідарнасць”. Сітуацыя ўскладнялася тым, што на гэты раз ва ўладзе былі яе прадстаўнікі. Настроі падагрэла заява вясной 1989 г. лідара “Салідарнасці” Л. Валенсы аб намеры стаць прэзідэнтам Польшчы. На той момант гэтую пасаду займаў В. Ярузэльскі. На гэтым фоне ў прафсаюзе адбыўся раскол, у выніку якога частка дзеячаў падтрымала Л. Валенсу, а другая выступіла на баку Т. Мазавецкага. У такой нестабільнай палітычнай сітуацыі далейшая рэалізацыя эканамічных пераўтварэнняў была пад знакам запытання. Аднак нават частыя змены ўрадаў – Я. Бялецкага, Я. Альшэўскага, У. Павляка, Х. Сухоцкай – не прыпынілі рэформ.

Па меркаванні Л. Бальцэровіча, у эканамічным развіцці Польшчы ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. самай вялікай праблемай стаў рэзкі заняпад гандлю з СССР, а таксама страты ад розніцы імпартных і экспартных цэнаў з-за пераходу да сусветных цэнаў і цэнаў у цвёрдай валюце. На думку спецыяліста, менавіта гэта прывяло да росту інфляцыі, падзення ўзроўню вытворчасці і зніжэнню рэнтабельнасці дзяржпрадпрыемстваў [1, с. 259-260]. Выхад са складанай сітуацыі эканамісты шукалі ў прыватызацыі, правядзенне якой у абмежаваным выглядзе пачалося яшчэ ў 1988 г. У 1990-1992 гг. у Польшчы хуткімі тэмпамі шла так званая “малая прыватызацыя” ў галіне гандлю, грамадскага харчавання і паслуг, якая паказала добрыя вынікі [17, с. 92]. За перыяд 1990-1992 гг. у Польшчы было зарэгістравана амаль 300 тысяч новых прыватных устаноў [18, s. 35]. А вось прыватызацыя буйных прадпрыемстваў шла вельмі марудна і выклікала крытыку з боку яе працаўнікаў.

Першапачаткова спецыялісты разглядалі некалькі магчымых варыянтаў раздзяржаўлівання: 1) стварэнне на базе дзяржаўных прадпрыемстваў акцыянерных таварыстваў, 2) перадача аб’ектаў ва ўласнасць органаў мясцовага самакіравання, 3) продаж маёмасці праз аўкцыёны ўсім зацікаўленым асобам і арганізацыям, у тым ліку замежным. Меркавалася, што да 1993 г. у прыватную уласнасць пяройдзе 50 % прадпрыемстваў.

Закон аб прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў быў прыняты 13 ліпеня 1990 г. і ўступіў у дзеянне 1 жніўня таго ж года. У ім вызначаліся 2 асноўныя метады пераводу маёмасці ў прыватную ўласнасць: 1) фондавая і 2) ліквідацыйная (або прамая) прыватызацыя. Больш дэталёва механізмы раздзяржаўлівання былі прапісаны ў дадатковых пастановах 1993 г. і новым законе аб прыватызацыі ад 1996 г. [19; 17, с. 76-77].

Спадзяванні ўрада на хуткае правядзенне прыватызацыі не спраўдзіліся, што было звязана з адмоўнымі сацыяльна-эканамічнымі паказчыкамі: падзеннем ўзроўню жыцця значнай часткі насельніцтва, ростам інфляцыі, нежаданнем замежных інвестараў укладаць сродкі ў польскую эканоміку з-за палітычнай і эканамічнай рызыкі, вялікая знешняя запазычанасць Польшчы перад заходнімі краінамі і інш. [17, с. 96, 20, с. 33; 21, с. 267].

Рэформы пачатку 1990-х гг. закранулі і аграрны сектар эканомікі, дзе яшчэ з сацыялістычных часоў разам з дзяржаўнымі і кааператыўнымі гаспадаркамі існавалі і прыватныя. У студзені 1990 г. урад заявіў аб неабходнасці ліквідацыі нерэнтабельных гаспадарак, дазволіў куплю-продаж зямлі і зняў абмежаванні на зямельныя надзелы.

PolotskSU



З аднога боку, гэта прывяло да пасілення прыватных, фермерскіх гаспадарак, а з другога непазбежна вяло да з'яўлення беззямельных сялян. Ва ўмовах, калі жорсткія манетарысцкія рашэнні распаўсюджваліся і на аграрны сектар (абмежаванні ў крэдытах і высокая працэнтная стаўка па іх, скарачэнне датацый, скасаванне мінімальных закупачных цэн і інш.), перамены ў краіне выклікалі негатыўную рэакцыю сялянства [16, с. 171-172].

Праведзеныя ў Польшчы на пачатку 1990-х гг. рэформы мелі як станоўчыя вынікі, у першую чаргу ў галіне макраэканомікі, так і адмоўныя – пераважна ў сацыяльнай сферы. Узровень жыцця насельніцтва на пачатку 1990-х гг. падаў, што выклікала напружанасць у грамадстве і вяло да росту пратэстных настрояў. Акрамя таго, у краіне назіраўся рост беспрацоўя, якое ў 1992 г. склала больш за 13 % [1, с. 262]. Гэтыя моманты актыўна выкарыстоўвалі розныя палітычныя сілы ў барацьбе за ўладу. Найбольш выразным сведчаннем незадаволенасці рэформамі сталі парламенцкія выбары 1993 г., калі перамогу атрымалі сацыял-дэмакраты – пераемнікі былой Польскай аб'яднанай рабочай партыі. Але нават яны не адмовіліся ад правядзення рэформ, звярнуўшы, аднак, большую ўвагу на іх сацыяльную складаючую.

За тры гады рэформ стала відавочна, што яны далі плён. На макраэканамічным узроўні гэта было бачна на прыкладзе узроўня інфляцыі адносна роста цэн, які спаў з 2000 % у 1989 да 44,3 % у 1992 г. [1, с. 262]. Сама інфляцыя, якая ў 1989 г. складала 251 % і дасягнула максімума ў 1990 г. у выглядзе 585 %, ужо ў 1993 г. была менш за 40 % і паказвала тэндэнцыю да зніжэння [3, s. 83]. Акрамя таго, павялічылася доля прыватнага сектара ў фарміраванні ВНП і доля занятых у прыватным сектары (без уліку сельскай гаспадаркі і кааператываў яна вырасла з 13,2 % у 1989 г. да 34,4 % у 1992 г.), вырасла доля прадукцыі ў прыватнай вытворчасці – з 7,4 % у 1989 г. да 36,6 % у 1993 г., назіралася павышэнне якасці тавараў і паслуг [1, с. 284].

Было б памылкова сцвярджаць, што праграма рэформ, прапанаваная Л. Бальцэровічам, не мела хібаў. Несумненна, яны былі і за гэта і аўтар, і самі пераўтварэнні падвяргаліся і падвяргаюцца крытыцы [гл., напрыклад: 22]. Але, як справядліва зазначае расійская даследчыца Р. Р. Герасімава, той факт, што Польшча, як і іншыя краіны былога сацыялістычнага лагера, з'яўляюцца паўнапраўнымі сябрамі Еўрапейскага Саюза, сведчыць пра тое, што "задачы правядзення паўнавартаснай трансфармацыі са стварэннем рыначнай эканомікі, дэмакратычнага прававога грамадства … выкананы" [23, с. 17].

ЛІТАРАТУРА

1. Бальцэровіч, Л. Сацыялізм. Капіталізм. Трансфармацыя / Л. Бальцэровіч ; пер. з польск. – Мінск : Лекцыя, 2000. – 341 с.
2. Kowalski, T. Polska transformacja gospodarcza na tle wybranych krajów Europy Środkowej [Electronic resource] / T. Kowalski // Ruch prawniczy, ekonomiczny i socjologiczny. – Rok LXXI. – 2009. – Zeszyt 2 – Mode of access: https://repozytorium.amu.edu.pl/bitstream/10593/4886/1/15_Tadeusz_Kowalski_Polska%20transformacja%20gospodarcza_253-278.pdf. – Date of access: 21.05.2018.

PolotskSU




3. Jarmołowicz, W. Polska transformacja gospodarcza. Przesłanki – przebieg – rezultaty [Electronic resource] / W. Jarmołowicz, D. Piątek. – Mode of access: https://owe.pte.pl/upload/files/ksiazki/05_Jarmolowicz%2C%20Piatek.pdf. — Date of access: 21.05.2018.
4. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/74/437. – Date of access: 04.03.2018.
5. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/438/1. – Date of access: 04.03.2018.
6. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/74/439. – Date of access: 04.03.2018.
7. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/74/440. – Date of access: 04.03.2018.
8. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/74/441. – Date of access: 04.03.2018.
9. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/74/442. – Date of access: 04.03.2018.
10. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/74/443. – Date of access: 04.03.2018.
11. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/75/445. – Date of access: 04.03.2018.
12. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/75/446. – Date of access: 04.03.2018.
13. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/75/448. – Date of access: 04.03.2018.
14. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/75/449. – Date of access: 04.03.2018.
15. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1989/s/75/450. – Date of access: 04.03.2018.
16. Центрально-Восточная Европа во второй половине XX века : в 3 т. / редкол. А.Д. Никипелов [и др.]. – М. : Наука, 2002. – Т. 3 : Трансформации 90-х годов. Ч. 2. – 464 с.
17. Приватизация в странах Центральной и Восточной Европы: первые результаты : сб. ст. – М. : РАН, 1998. – 221 с.
18. Woźniak, M.G. Zmiany strukturalne gospodarki Polski po 1990 roku [Electronic resource] / M.G. Woźniak // Prace komisji geografii przemysłu. – № 12. – Warszawa-Kraków, 2009. – S. 34–43. – Mode od access: http://cejsh.icm.edu.pl/cejsh/element/bwmeta1.element.desklight-7fdf5715-f892-4fbb-add5-1d27a1d1aec2/c/489-1480-1-PB.pdf. – Date of access: 5.06.2018.
19. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polski [Electronic resource]. – Mode of access: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1990/s/51/298. – Date of access: 04.03.2018.
20. Гебл, А.Х. Экономические преобразования в странах Центральной и Восточной Европы (проблемы, тенденции, перспективы) / А.Х. Гебл, Ч. Грей ; пер. с англ. – М. : Прогресс ; Универс, 1995. – 112 с.

PolotskSU



21. Козік, Л.А. Прыватызацыя як сродак эканамічнай мадэрнізацыі Польшчы ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. / Л.А. Козік // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 4 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2009. – С. 265–269.
22. Барабанов, М.В. Постсоциалистическая трансформация в восточноевропейских странах и Европейский Союз: основные направления и результаты, достижения и проблемы, успехи и разочарования / М.В. Барабанов. – М. : Ред.-изд. центр МГГУ, 2015. – 249 с.
23. Герасимова, Р.Г. Сравнительный анализ экономического развития и рыночных реформ в странах с переходной экономикой в 1990-2009 гг. / Р.Г. Герасимова. – М. : Инфа-М, 2012. – 180 с.

## ECONOMIC REFORM IN POLAND (1990–1993 gg.) AND THEIR RESULTS

*L. KOZIK*

*At the end of the 1980s the democrats came to power in Poland. They announced the building of a democratic society and the transition to a market economy. In this regard, a group of economists led by L. Balcerowicz developed the program of reforms, which was called "shock therapy". Macroeconomic stabilization, microeconomic liberalization and institutional restructuring associated with privatization were the main elements of the economic transformation. In Poland the reforms had negative social consequences, primarily due to the emergence and growth of unemployment, as well as the decline in the standard of living of a large part of the population. However, already in 1993, positive changes in the economic life of Poland became evident. They were consolidated by the next subsequent reforms.*

*Keywords: economic reforms, Poland, L. Balcerowicz, “shock therapy”, privatization, unemployment*